Гродна: не ўсе ўдзячныя. Навагрудак: натоўп шалеў ад шчасця (стар. 2)
Экалогія — гэта не толькі Чарнобыль (стар. 3)

СВАБОДА

Год заснавання 1902
Выходзіць з 1990
Намеснік галоўнага рэдактара Усевалад Рагойша
Заснавальнік і выдавец Павел Жук
Наклад 42.050
Адрас рэдакцыі:
220088, Мінск, вул.Іванаўская, 56
Тэл./факс 362441

20 жніўня 1996 г. № 62 Кошт свабодны

Новая бітва

Выступіўшы перад прадстаўнікамі грамадскасці ў Гродне, прэзідэнт Лукашэнка распачаў бітву за «ўраджай», які збіраецца сабраць 7 лістапада



Лукашэнка абвінаваціў парламент і яго кіраўніцтва ў нядольнасці «арганізаваць дзелавы заканатворчы працэс». На ягоную думку, «дэпутаты зноў заняліся прапагандай і агітацыяй у асноўным супраць прэзідэнта».

Аднак, відавочна, што гэты «абстрэл» парламента перад пачаткам чарговай сесіі выклікана аднай мэтай — запалохаць дэпутатаў. Карыстаючыся манапольным правам на сродкі масавай інфармацыі, прэзідэнт амаль дзве гадзіны тлумачыў народу, чаму ён узяўся рабіць Канстытуцыю «пад сябе». Прычым менавіта яна павінна стаць «стабільнай» на доўгі тэрмін.

Пасля герба і сцяга грамадства атрымае яшчэ і лукашэнкаўскую Канстытуцыю. Пасля ажыццяўлення гэтай ідэі ў нашай краіне пачнуць нараджацца Лукашэнкі — вялікія і маленькія... Зноў напаўзае ідэалогія «адзінства думкі», што азначае брыдкую шэрасць.

Дзеля таго, каб абвінавачванні супраць сённяшняга парламента выглядалі больш істотнымі, прэзідэнт прыгадвае свой дэпутацкі вопыт. Ён шкадуе, што мінулы парламент растаптаў Канстытуцыю БССР і СССР, сцвярджае, што «Вярхоўны Савет шляхам сумнiўнай працэдуры «хатняга галасавання» прыняў Канстытуцыю», навязаўшы, па сутнасці, грамадству сваю волю». Аднак нельга забывацца, што менавіта дзякуючы ёй дэпутат Лукашэнка стаў прэзідэнтам.

Прэзідэнт сказаў, што «новых выбараў не будзе». І гэтая заява выглядае абсалютна лагічнай у ягоных адносінах да выбарчага права грамадзянаў, якім прэзідэнт выдатна навучыўся маніпуляваць.

Знайшоўшы новага ворага ў асобе новага парламента, Лукашэнка выкарыстоўвае шырокі арсенал сродкаў для абстрэлу. Ён надта абураўся, што парламент «на працягу двух дзён абмяркоўваў праблемы прастрэленых ягадзіц маладой супрацоўніцы». Ну што ж, калі прэзідэнта гэтая частка цела не цікавіць... Пасаж «з ягадзіцамі» атрымаўся настолькі ўдалым, што яго дружна перадрукавалі афіцыйныя газеты. Разам з тым больш важная частка выступлення ў газетах чамусьці прапала. Прэзідэнт, гаворачы пра пытанні рэферэндуму, ясна сказаў: *«Я стаўлю пытанне пра давер прэзідэнту»*. Магчыма, прэзідэнцкая каманда задумалася, як яго лепей сфармуляваць ці замяніць «давер» на імпічмент. Ва ўсякім разе парламент мае права таксама папрацаваць над гэтым дадаткова аб'яўленым пытаннем рэферэндуму.

Дзеля таго, каб завяршыць свой вобраз, прэзідэнт Лукашэнка яшчэ раз нагадаў электарату, што ён не прадаецца. Дзеля пацвярджэння гэтага ён скарыстаў вайсковую Ганцавіцкую станцыю ў Брэсцкай вобласці, на знішчэнне якой нехта даваў 10 мільярдаў, якія Лукашэнка не ўзяў. Затое прэзідэнт Ельцын «дараваў» Лукашэнку 1 млрд. 300 млн. долараў. Сціплы Лукашэнка выбраў меншае.

Прэзідэнт вельмі хоча выйграць бітву за ўраджай, ён адназначна заявіў з тэлеэкрана: *«Я не хацеў бы, каб народ ад мяне адмовіўся»*. Відавочна, што прэзідэнту надта не хочацца развітвацца са сваім крэслам, да якога ён прызвычаіўся за два гады, і збіраецца яго праседжваць яшчэ два тэрміны.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

Заўтра – круглы стол

Як паведаміла на прэс-канферэнцыі кіраўнік аргкамітэта Валянціна Свяцкая, круглы стол пачне сваю работу 21 жніўня ў Мінскім культурна-асветніцкім цэнтры (вул.Кастрычніцкая, 5).

Першы этап працягнецца адзін дзень, тады мяркуецца прызначыць дату чарговага паседжання. Нягледзячы на жорсткі ўціск і спробы ўладаў унесці раскол, ніводная з партый не адмовілася ўдзельнічаць у «круглым стале». Цікавасць да яго выказалі 17 палітычных партый, прафсаюзаў і іншых грамадскіх арганізацый.

Валянціна Свяцкая распавяла пра свой паход у прэзідэнцкую адміністрацыю, каб асабіста перадаць запрашэнне Лукашэнку. Аднак «самога» ўбачыць не давялося. Удзельнікі аргкамітэта спадзяюцца на ягоную «разважлівасць». У рабоце круглага стала прыме ўдзел спікер беларускага парламента Сямён Шарэцкі, старшыня Савета федэрацыі прафсаюзаў Уладзімір Ганчарык. Праведзеныя кансультацыі з віцэ-прэм'ерам Сяргеем Лінгам.

В.Свяцкая адзначыла, што праект Пагаднення ўдзельнікаў круглага стала ўтрымлівае сем пунктаў. У ім пакуль што не ідзе гаворка пра імпічмент прэзідэнта. Вядома, аднак, што БНФ прапанаваў свой пункт аб гарантыі захавання правоў і свабод чалавека ў Рэспубліцы Беларусь. Як адзначылі ўдзельнікі аргкамітэта, «хоць прэзідэнт і не хоча нас слухаць, мы пастараемся данесці да яго сваю думку».

Аргкамітэт не выключае магчымасці, што правядзенне круглага стала можа быць забаронена ўладамі, і тады «давядзецца прыгадаць старыя метады барацьбы» і правесці гэтую палітычную імпрэзу за межамі Беларусі.

Мікола ВАЙТОВІЧ

З Мінска – у Віцебск

Для С.Адамовіча пайшоў шосты месяц за кратамі

Вярхоўны Суд Беларусі вырашыў, што ў першай інстанцыі крымінальную справу паэта Славаміра Адамовіча будзе разглядаць Віцебскі абласны суд.

Нагадаем: Адамовіч абвінавачваецца па 4-х артыкулах Крымінальнага кодэкса. У прыватнасці, за напісанне верша «Убей президента», надрукаванага ў Віцебскай газеце «Выбар», за спробу пераходу дзяржаўнай мяжы і незаконнае нашэнне халоднай зброі.

Віцебскім суддзям давядзецца азнаёміцца з чатырма тамамі крымінальнай справы, якую старанна падрыхтаваў КДБ. Магчыма, гэты працэс зацягнецца да верасня.

С.Адамовіча з Мінскага следчага ізалятара КДБ перавезлі ў Віцебскую турму. 14 жніўня ў Віцебск прыязджала маці паэта Юзэфа Паўлаўна. Адміністрацыя турмы адмовіла ёй у спатканні з сынам.

Валодзя ЯНЧУК

Андрэй Рамашэўскі патрабуе апраўдання

Лідэр Партыі аматараў піва Андрэй Рамашэўскі апратэставаў у Мінскі гарадскі суд рашэнне Ленінскага райсуда сталіцы, вынесенае па ягонай справе 19 ліпеня.

Як памятаем, кіраўнік ПАП прызнаны вінаватым у злосным хуліганстве падчас студэнцкай акцыі ў траўні 1995 года і асуджаны на два гады пазбаўлення волі ўмоўна з выпрабавальным тэрмінам адзін год. Разгляд скаргі А.Рамашэўскага ў Мінгарсудзе мае адбыцца ў гэтую пятніцу, 23 жніўня. Андрэй Рамашэўскі, як паведаміў ягоны адвакат Арсень Скаруліс, патрабуе апраўдання за адсутнасцю складу злачынства.

Раман ЮРЭВІЧ

Зняволеных украінцаў наведаў консул

Консулу пасольства Украіны нарэшце далі магчымасць наведаць следчы ізалятар МУС, дзе ўжо тры з паловай месяцы знаходзяцца сем украінскіх грамадзян, якія ўдзельнічалі ў «Чарнобыльскім шляху-96».

Консул М.Маскаленка пагутарыў з імі і перадаў падарункі ад супрацоўнікаў пасольства — нацельную бялізну, прадметы туалету, прадукты харчавання, цыгарэты, сшыткі і ручкі. Па словах М.Маскаленкі, затрыманыя — дарэчы, некаторыя з іх яшчэ нават не ведалі, што суд прызначаны на 21 жніўня, — «чакаюць аб'ектыўнага прыгавору». Яны звярнуліся таксама да консула з просьбай запрасіць для удзелу ў працэсе бацькоў і ўкраінскіх парламентарыяў, якія прадстаўляюць партыю УНА ў Вярхоўнай Радзе. Затрыманыя таксама паведамілі М.Маскаленку, што ў перанаселеных камерах і пры 100-працэнтнай вільготнасці ў іх пачынаюць развівацца захворванні скуры.

БелаПАН

Міністэрства юстыцыі камандуе судом?

Як ужо паведамлялася, 25 ліпеня Беларускі народны фронт накіраваў у Вярхоўны суд абскарджанні на вынесеныя мінюстам афіцыйныя папярэджанні. Вярхоўны суд накіраваў справу ў Маскоўскі раённы суд г.Мінска, пра што пісьмова паінфармаваў кіраўніцтва БНФ.

Разам з тым днямі міністэрства юстыцыі распаўсюдзіла інфармацыю для прэсы за подпісам намесніка міністра Віктара Галаванава, у якой сцвярджаецца, што «рассмотрение подобных жалоб в судебном порядке не предусмотрено действующим законодательством. Поэтому жалобы руководства БНФ Верховным Судом Республики Беларусь и судом Московского района г.Минска к рассмотрению не приняты».

Аднак, па словах выконваючага абавязкі старшыні БНФ Лявона Баршчэўскага, афіцыйнага адказу аб адмове прыняць скаргу да разгляду ні з Вярхоўнага, ні з Маскоўскага раённага суда не паступала. «Гэта несур'ёзна і несалідна, калі правая рука не ведае, што робіць левая. Гэта сведчыць пра ўзровень і міністэрства, і судоваправавой сістэмы ў краіне», — заявіў Лявон Баршчэўскі.

Раман ЮРЭВІЧ

«Франтавая» зводка жніва папоўнілася яшчэ адной ахвярай. 16 жніўня ў калгасе «Шлях да камунізма» грузавік са збожжам пераехаў 40-гадовага механізатара Васіля Сотнікава, які пасля абеду прылёг адпачыць у цяньку.

Самае жахлівае ў гэтым трагічным выпадку тое, што ўсе шафёры адмовіліся везці свайго яшчэ жывога таварыша ў раённую бальніцу. Яны чакалі адзінага цвярозага вадзіцеля, які павінен быў прыехаць з Гомеля.

Ад цяжкіх калецтваў Сотнікаў памёр у бальніцы. Сіротамі засталіся дзве дачкі.

А.МІКУЛІЧ

Уніяцкая царква адраджаецца

15 жніўня ў Магілёве асвечана першая грэка-каталіцкая капліца ў Беларусі. З гэтае нагоды ў нашай краіне пабываў прэфект ватыканскай Кангрэгацыі ўсходніх цэркваў кардынал Акіле Сільвестрыні. Доўгі час гэтая капліца святога Язафата Кунцэвіча на магілёўскіх могілках знаходзілася ў занядбаным стане. Яе аднавілі самі вернікі.

(Працяг тэмы на стар. 2)

ХРОНІКА

У НЯДЗЕЛЮ, 18 жніўня, Аляксандр Лукашэнка неафіцыйна наведаў сваю бацькаўшчыну — Шклоўшчыну.

Спачатку ён наведаў маці ў в.Александрыя, а потым амаль тры гадзіны прабыў побач з жонкай і малодшым сынам, якія жывуць у в.Рыжкавічы. Увечары ён правёў нараду з калгасным начальствам на камбікормавым заводзе.

Аляксандр ШЧАРБАК

У ПАНЯДЗЕЛАК, 19 жніўня, на тэрыторыі Мінскага аўтамабільнага завода каля цэнтральнай прахадной адбыўся мітынг. Удзел узялі прыкладна 4—5 тысяч чалавек.

Удзельнікі мітынгу, які доўжыўся амаль гадзіну, выпрацавалі рэзалюцыю, якую вырашылі даслаць прэзідэнту, у парламент і Кабінет міністраў. Першым пунктам запісана патрабаванне выплаціць да 23 жніўня запазычанасць па зарплаце за чэрвень. Калі гэта не будзе выканана, рабочыя прыгразілі страйкам.

Кіраўніцтву прадпрыемства давядзецца выканаць вельмі складаную задачу: дзе ж узяць грошы? Рэч у тым, што сёння завод 91% сваёй прадукцыі рэалізоўвае толькі па бартэру. А той невялікай сумы «зайцоў» (9%) не хапае на ўсіх 25 тыс. працаўнікоў.

Валодзя ЯНЧУК

Падпішыся – і ты выйграеш!

Пачалася падпісная кампанія на IV квартал. Газету СВАБОДА можна выпісаць у любым аддзяленні сувязі і «Белсаюздруку».
*Кошт падпіскі: на месяц — **10** тыс. рублёў, на квартал — **30** тыс. рублёў*
Наш падпісны індэкс – 63887

© PDF: Kamunikat.org 2010
© Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ГРОДНА

Не ўсе ўдзячныя

Аляксандр Лукашэнка сказаў, што ён асабліва ўдзячны жыхарам Гродзенскай вобласці, якія на выбарах аказалі яму «найбольшую падтрымку». Але далёка не ўсе гродзенцы ўдзячныя прэзідэнту.

Выступленне прэзідэнта ў Гродзенскім абласным тэатры перад працоўнымі калгасаў, саўгасаў, ветэранамі вайны і працы, «вертыкаллю» бачыла і слухала ўся краіна, потым тэкст выступу (з некаторымі купюрамі) апублікавалі афіцыйныя газеты. Аднак не менш цікавыя моманты засталіся па-за ўвагай дзяржаўных СМІ.

Найперш трэба зазначыць, што да прыезду Лукашэнкі ў Гродна сур'ёзна рыхтавалася мясцовая «вертыкаль». Як і ў былыя часы, горад практычна вылізвалі. На будынку пошты па вул. Ажэшкі, побач з аблвыканкамам, аднавілі нават стары СССРаўскі герб. Побач з абласным тэатрам і тытунёвай фабрыкай пачалі ўрачыста струменіць фантаны, якіх не ўключалі ў гэтым годзе ніводнага разу. Уздоўж дарогі, дзе праязджаў Лукашэнка, павыстаўлялі латкі з печывам, півам ды кілбасамі.

Адначасова да сустрэчы рыхтаваліся і «простыя» гарадзенцы. Уначы перад прыездам бацькі на дарогах і сценах будынкаў у розных раёнах горада з'явіліся надпісы накшталт «Беларусь — У Еўропу, Лукашэнку — у ....». Некалькі чалавек былі затрыманыя ў тры гадзіны ночы ў цэнтры горада побач з мурамі гарадзенскай турмы. Іх абвінавацілі ў тым, што быццам бы яны зрабілі надпіс на дзвярах турмы «Камеру для Лукашэнкі». Ужо з раніцы камунальнай гаспадаркі прыбываліся працы — трэба было тэрмінова пазамазаць усе надпісы. Аднак самыя цікавыя падзеі адбыліся вакол тэатра, калі Лукашэнка выйшаў са свайго лімузіна. У той час, калі прэзідэнт толькі хацеў адкусіць кавалак каравая, у чатырох-пяці кроках ад яго раптоўна ўзняліся бел-чырвона-белыя сцягі і плакаты з надпісам «Наша радзіма — Беларусь, твая — Расея», а таксама пачалося гучнае скандзіраванне «Лукашэнку — у адстаўку!». Лукашэнка мужна накіраваўся ў бок тых людзей, што крычалі. У гэты ж самы момант на людзей налецелі міліцыянты і пачалі вырываць з рук сцягі і плакаты, аднак Лукашэнка даў загад: «Адпусціце іх, я і так яшчэ буду два тэрміны прэзідэнтам». І ўсё ж велікадушны настрой быў моцна папсаваны. Яшчэ адзін інцыдэнт адбыўся каля тэатра, калі Лукашэнка прамаўляў свае крылатыя словы (яны трансляваліся праз дынамікі на вуліцу) і рашуча запэўніваў публіку, што не будзе ніякіх давыбараў у Вярхоўны Савет. У гэты момант маладыя людзі побач з тэатрам кінулі пад ногі чырвона-зялёны сцяг і пачалі яго таптаць. Аднаго з іх міліцыянты адразу пацягнулі ў машыну.

А ўвогуле гарадзенцы не асабліва зацікавіліся візітам. Да тэатра прыйшло чалавек пяцьсот, дый тыя праз паўгадзіны, паслухаўшы чарговыя байкі, пачалі разыходзіцца. Крыху затрымалі публіку адкрытыя латкі з півам і закускою: людзі пілі сабе піва ды пасмейваліся з прэзідэнцкай прамовы. Але ж гэта было зусім не смешна.

М.М.

Адразу пасля гродзенскага выступу Лукашэнкі першы намеснік старшыні Вярхоўнага Савета Беларусі Васіль Новікаў прадаставіў СВАБОДЗЕ сваё эсэ «Против лома нет приема, окромя другого лома, или Воспоминания о будущем Беларуси», асобныя раздзелы якога мы прапануем чытачам

Василий НОВИКОВ

Волеизъявление по указу

Фальсификация плебисцита

У всех лето. Уборка, отпуска, дачи, школа на носу... А президент без устали мечется по республике. Чего ради? Сам же все время на многочисленных встречах с людьми твердит, что дела идут на поправку, экономика на подъеме и за рубежами у него полный ажур. Что так уж припекло?

Он ведет себя так, как если бы про себя знал, что горячая и верная любовь к нему избирателей испытаний далее 7 ноября не выдержит и, вчера еще такая полноводная, в одночасье схлынет — как ее и не было, и сменится другим чувством, до которого обычно в таких случаях остается только шаг.

Не потому ли он так торопится заполучить одобрение Белорусского Национального Конгресса? Оно ему крайне необходимо. Размахивая вердиктом «вече», как шашкой наголо, он и пойдет в решающую атаку — издаст самолично указ о проведении референдума. Иного выхода у него просто нет.

Так, и только так, именно по такому сценарию и должно свершиться фактическое отстранение от законодательной власти депутатов, а проще говоря — разгром Верховного Совета.

И само волеизъявление в Беларуси должно пройти по указу президента — по форме. По содержанию это будет фальсификация плебисцита.

Что А.Лукашенко готов на такой произвол, у меня не вызывает ни грамма сомнений. Он привык безнаказанно нарушать законы и Конституцию. Возможны лишь умопомрачительные извивы его гибкого беспредельного популизма. А за ними и вовсе дело не станет, он свои собственные слова переврет, перелицует и не покраснеет, только вдохновения прибавится.

Соображения о преступности подавления законодательной власти или откровенной фальсификации плебисцита главу государства ничуть не смутят. На то и начинающий диктатор. Он прекрасно знает, на что решился, и боится только одного — как бы не свернуть себе шею в этой самой пока грандиозной и опасной авантюре, как бы обеими руками и как можно крепче ухватить, наконец, ее, вожделенную, единственную возлюбленную холостякующего нашего президента — безраздельную власть.

Пособники узурпатора – «вертикальщики» и «конгрессмены»

Произвол — совершен ли он правителем, то ли его приспешниками, либо представителями широкой общественности, или даже самим народом — не перестает быть преступлением.

И очень многие из тех, кто в эти дни под грубым нажимом способствует становлению диктатуры в республике, в душе прекрасно осознают, в каком злодеянии участвуют. Но «вертикальщики» обыкновенные ж люди. У кого животный страх, у кого завидная должность, у кого малые детки...

Делегаты «всенародного вече» на то и будут собраны, чтобы разделить ответственность с А.Лукашенко за готовящийся антиконституционный переворот. И я сегодня вижу — «конгрессмены» пойдут на это. Сильно запуганные, или, наоборот, обласканные высочайшей милостью, вконец запутанные оголтелой пропагандой, или, напротив, втайне рассчитывая на оплату оказанных услуг — они одобрят... И при этом каждый оправдается перед собственной совестью. На то и бесшабашная наша славянская широкая натура!

Все подготовлено к тому, чтобы осуществилась самая заветная мечта Александра Григорьевича: он один над своим народом.

Я прогнозирую, что если все пойдет по задуманному сценарию, то на референдуме 7 ноября 1996 года люди вполне могут дать президенту все, чего он хочет. Народ Беларуси близок к тому, чтобы назначить над собой диктатора.

Вся сила на стороне президента. На стороне Верховного Совета только Право. Но когда оно будет окончательно попрано, защиты Закона лишится вся страна и каждый ее гражданин в отдельности.

Гений политической интриги

С предельной четкостью понимаю я, один из руководителей Верховного Совета, какую игру ведет Александр Грuгорьевич. И тем не менее повторяю: я, депутат и законодатель волей моих избирателей, не вправе, не могу и не буду потакать прихотям взбалмошного и практически неуправляемого, к тому же хамоватого президента.

Уж если и надо проводить референдум — то без суматохи, и только строго по закону, и лишь с соблюдением всех обязательных процедур. Нельзя такое святое дело как плебисцит превращать в ежегодное шоу вроде «Славянского базара» в Витебске. Нельзя унижать народ республики всем этим пошлым трюкачеством.

И, скажу я вам, дорогие мои сограждане, именно эта здравая, государственная и цивилизованная позиция и загоняет Верховный Совет в безвыходное, а по существу трагическое положение. Как то и замышлялось, мы, депутаты, попадаем в ловушку, сработанную с коварством, достойным гения политической интриги. «Гений» употребляю без преувеличения и сарказма: так оно и есть.

Александр Григорьевич выкрикнет: ату их, людцы, этих негодяев, они меня опять обижают, не дают обратиться прямо к любящему меня народу, ну так я сам, без них, распоряжусь и приму жесткое решение. Обычный для него ход, он тысячу раз его уже применял.

Между тем ныне, в августе, с президентскими поправками в Конституцию законно избранный депутатский корпус и ознакомиться не имеет возможности. Нам в Верховный Совет администрация президента пообещала предоставить только к середине сентября это произведение, над которым корпела безымянная команда неких «подпольных законодателей».

Или они проект еще лихорадочно дописывают? Или что скрывают? Хотя хлестко и безапелляционно, в своем стиле ниспровергателя всего и вся, совсем недавно в одной из своих многословных и длинных речей всенародный любимец утверждал, что ныне действующая Конституция Республики Беларусь была разработана келейно, без совета с населением и без его одобрения. Вот уж воистину вселенское фарисейство! Ведь в том «келейном кругу» «скрывался от народа» и сам тогда парламентарий, член Конституционной комиссии, ее разработчик и один из ее «отцов» — Александр Лукашенко.

НАВАГРУДАК

Натоўп шалеў ад шчасця

Навагрудак рыхтаваўся да прыезду Лукашэнкі заўзята. Раптоўна ў зусім нечаканых месцах узніклі клумбы, і нават людзі ў белых халатах з дзіцячай кансультацыі дружна выйшлі на добраўпарадкаванне вуліцы.

Прэзідэнцкі верталёт прызямліўся на ўзорна-паказальным полі калгаса «Авангард». Як толькі машына паказалася на небе, адразу пачалі жніво тры камбайны. З верталёта выйшлі начальнік ахоўы прэзідэнта Барodзіч, нядаўна прызначаны памочнік Каралёў, сам Лукашэнка і шэф Нацбанка Віннікава. Тут ужо чакала раённае начальства. З навакольных вёсак сабралася нямала ахвотнікаў паглядзець на жывога прэзідэнта, яны былі расселіся на пагорку, але пасля ахова адагнала іх далей. Прэзідэнт усё ж уступіў з сялянамі ў бліц-дыялог, пацікавіўшыся, што яны думаюць накошт «зямельнага пытання». «Мы — за калгас! Мы за тое, каб адабраць зямлю ў фермераў, бо яны толькі набіваюць кішэні грашыма!» — загулі мужыкі. Праўда, выйшаў і адзін «пракол». Лукашэнка спрабаваў папракнуць сялян, што, маўляў, іхні дэпутат раз'язджае па розных амерыках, яўна намякаючы на С.Шарэцкага, але тыя адказалі: «Гэта не наш. Гэта за пятнаццаць кіламетраў адсюль», — і цікавасці да «дэпутацкай» тэмы не праявілі.

Транспарт для высокай дэлегацыі ледзь не спазніўся, бо «штурманы» дабіраліся да месца па ваенных картах 1961 г., але ўсё ж вялікай затрымкі не было. Натуральна, усе дарогі былі ачэпленыя і перакрытыя, дзеля гэтага навагрудскім міліцыянтам даваліся выклікаць падмацаванне з Дзятлава і Карэліч.

Проста з поля прэзідэнт накіраваўся на завод газавай апаратуры, які выпускае вогнетушыцелі, газавыя сістэмы для аўтамабіляў і бытавых пліт. Напярэдадні ўсіх рабочых жорстка праінструктавалі: працаваць, з месца не ўставаць, прыватных пытанняў і скаргаў (накшталт таго, што не выдаюць спецадзенне) не ўздымаць. А калі ўсё ж гаворка пачнецца, то прасіцца зноў у аб'яднанне «Саюзгазмашаппарат», у склад якога завод некалі ўваходзіў. Маўляў, там, у Цэнтры, усё ёсць: і метал, і газавыя аўтазапраўкі, для якіх завод робіць дэталі.

Дарэчы, дарма некаторыя папракаюць Лукашэнку ў адсутнасці рынкавага мыслення. Калі адзін старэйшага веку чалавек задаў прэзідэнту «заказырыстае» пытанне, чаму была кілбаса па 28 тысяч, а цяпер ёсць па 50 тыс., то ён адказаў сапраўды па-рынкачнаму: «Таму што каўбаса павінна быць і для бедных, і для багатых».

Пасля завода працэсія рушыла на плошчу Леніна, дзе каля Дома-музея А.Міцкевіча сабралася з паўтысячы навагрудцаў. Грымелі воплескі. Натоўп літаральна шалеў ад шчасця. Гэта было як з'яўленне бога. Пад роздагалас акіяну эмоцый прэзідэнт усклаў кветкі да помнікаў воінам-інтэрнацыяналістам і Невядомаму салдату.

Народная любоў дасягнула піку падчас развітання. Натуральна, усіх да Лукашэнкі блізка не пусцілі, міліцыя з цяжкасцю стрымлівала ахопленых эйфарыяй натоўп. Самым шчаслівым удалося паціснуць прэзідэнту руку. Асабліва могуць ганарыцца навагрудскія настаўнікі, бо прэзідэнт высока і па-народнаму трапна ацаніў іхнюю ролю: «Потеряем учителя — капец, будзем ходить пьяные и дурные».

І ўсё ж старанні навагрудскага начальства не здолелі стварыць уражанне ўсеагульнага дабрабыту і шчасця. Пасля наведвання фірменнай крамы калгаса імя Кірава, дзе прэзідэнт падзівіўся пустаце прылаўкаў, і размовы з гараджанамі прынятае рашэнне стварыць спецыяльную камісію службы кантролю для праверкі, як чыноўнікі працуюць са скаргамі і зваротамі грамадзян. Сёння, у аўторак, навагрудская «вертыкаль» збіраецца на тэрміновую нараду: што рабіць?

Сяргей СТУЖКА

Уніяты – не «пятая калона»

Ватыканскі кардынал Акіле Сільвестрыні наведаў Беларусь з трохдзённым візітам па благаславенні Папы Рымскага. 14 жніўня ў аэрапорце Мінск-2 яго сустрэў апостальскі нунцый у Беларусі Дамінік Грушоўскі і ўпраўляючы дэканата Беларускай грэка-каталіцкай царквы протапрэсвітэр Ян Матусевіч. У гэты ж дзень кардынал Акіле Сільвестрыні накіраваўся на афіцыйную аўдыенцыю да мітрапаліта Філарэта. На сустрэчы закранаалася пытанне адзінства каталіцкай і праваслаўнай царквы. Да святкавання 400-годдзя Берасцейскай уніі праваслаўнае кіраўніцтва ставіцца рэзка адмоўна. Кардынал паведаміў, што гэтая дата адзначаецца ў свеце на ўзроўні Ватыкана.

Кардынал Сільвестрыні сустрэўся ў мінскім гатэлі «Планета» з кардыналам Казімірам Свёнткам, які выказаў пажаданне, каб Рым не пакідаў Беларусь без духоўнай апекі. Кардынал Свёнтак адзначыў, што рыма-каталікі і уніяты — дзеці адной каталіцкай царквы.

Вернікі, аднак, выказваюць насцярогу, што БГКЦ можа пераўтварыцца ў «пятую калону» польскага касцёла. На вялікі жаль, такія тэндэнцыі маюць месца.

У службе Божай каля капліцы ў Магілёве бралі ўдзел разам з грэка-каталіцкімі святарамі з усёй Беларусі менавіта польскія ксяндзы. Падчас урачыстасці быў нададзены сан архімандрыта апостальскаму візітатару для беларускіх уніятаў айцу Яну Сяргею Гаеку, паляку, прафесару Люблінскага каталіцкага універсітэта. Менавіта ён «прадстаўляў» нашых уніятаў на святкаванні 400-годдзя Берасцейскай уніі ў Ватыкане. З нагоды юбілею Папа накіраваў пасланне да Украінскай грэка-каталіцкай царквы, а ніхто нічога не было згадана пра БГКЦ. Аднак у час візіту кардынал Акіле Сільвестрыні падкрэсліў, што унія найперш паўстала на Беларусі, а затым на Украіне.

БГКЦ робіць толькі першыя крокі ў адраджэнні. Зарэгістравана 11 парафій, працуе пяць святароў. У Полацку завяршаецца будаўніцтва уніяцкай царквы, асвячэнне якой плануецца ў дзень парафіяльнага свята Язафата, арцыбіскупа і пакутніка Полацкага. У Мінску і Гомелі уніяты служаць у касцёлах, а ў іншых гарадах — у прыватных дамах.

Абмяркоўваецца пытанне пра стварэнне іерархіі БГКЦ. Вернікі ў Беларусі спадзяюцца, што кіраўніком царквы стане айцец Аляксандр Надсан з Лондана, які цяпер з'яўляецца апостальскім візітатарам для беларускіх грэка-католікаў у замежжы.

Алесь ДАШЧЫНСКІ

ЦЫТАТЫ

Каментарый выконваючага абавязкі старшыні Беларускага народнага фронту Лявона Баршчэўскага на заяву прэзідэнта А.Лукашэнкі аб тым, што давыбараў у Вярхоўны Савет не будзе, быў кароткі. «Я лічу, што, калі гэты чалавек застанецца пры ўладзе, давыбараў сапраўды не будзе. Вярхоўны Савет павінен з гэтага зрабіць свае вывады, толькі ён можа законным шляхам знайсці выхад з сітуацыі. Я маю на ўвазе імпічмент», — заявіў Лявон Баршчэўскі.

БелаПАН

Юры Захаранка: «Я яшчэ раз пераканаўся, што Беларусь не мае будучыні з такім прэзідэнтам.

Ствараецца такое ўражанне, што грамадзян, якія яго выбралі, ён лічыць за паўдуркаў. Уся прамова Лукашэнкі была пабудаваная на падмане і на падмене фактаў і абставін сённяшняга жыцця ў Беларусі. Прэзідэнт папросту байца непазбежнай адказнасці за поўны правал двухгадовага кіравання краінай».

В.В.

© PDF: Kamunikat.org 2010 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2010

ДЕНЬГИ

Если нужна ссуда...

«Беларусбанк» предлагает новый вид услуг — кредит в наличных белорусских рублях для физических лиц.

Например, на строительство и покупку индивидуального жилья кредит выдается в сумме до 75% сметной стоимости сроком до 15 лет под 65% годовых от ставки рефинансирования Национального банка (сейчас она составляет 55% годовых, следовательно ставка кредита 65 х 55% = 36%), на покупку и строительство гаражей в сумме до 75% сметной стоимости сроком до 5 лет под 54% годовых от ставки Нацбанка. Кредиты выдаются даже на ремонт домов и квартир под значительно более низкий процент — 36% от ставки рефинансирования. Не остались в стороне также дачи и садовые домики: на их строительство и покупку также предоставляются ссуды (до 75% сметной стоимости) сроком до 5 и 10 лет под 54% годовых от ставки рефинансирования.

Предусмотрены ссуды и на лечение детей (при наличии медицинского заключения) в сумме до 100 минимальных заработных плат на срок до 1 года под 30% от ставки рефинансирования. Для многих, несомненно, важен кредит на обучение на достаточно льготных условиях — на сумму до 70% годовой стоимости на срок до 1 года под 30% ставки рефинансирования. Ссуду могут получить также молодые семьи (до 30 лет) на сумму до 200 минимальных зарплат сроком до 5 лет под 36% ставки рефинансирования.

